# Назоўнік. Змяненне назоўнікаў па склонах

Урок беларускай мовы ў 4 класе

**Т. Р.  Буцько,**

настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі

Тонежскага дзіцячага сада – базавай школы

Сёння, у век высокіх тэхналогій, губляецца нітка, якая звязвае нас з мінулым, сучасным і будучым. Задача кожнага настаўніка - аднавіць і захаваць гэтую далікатную нітку, далучыць школьнікаў да гісторыі сваёй Радзімы, роднага краю, да роднай мовы, да светапогляду народа і яго культуры, да сістэмы маральных і духоўных каштоўнасцей.

Станаўленне сапраўднага патрыёта, выхаванне любові да Радзімы пачынаецца з малога: уменні па вартасці ацаніць, шанаваць і ганарыцца сваёй малой Радзімай. Таму на сваіх вучэбных занятках выкарыстоўваю мясцовы краязнаўчы матэрыял.

Увядзенне элементаў краязнаўства ў структуру вучэбных заняткаў актывізуе пазнавальную цікавасць малодшых школьнікаў, спрыяе ранняму фарміраванню «гістарычнага пачуцця», пачуцця прыналежнасці да мінулага, адказнасці за захаванне нацыянальнай культурнай спадчыны. дазваляе стварыць умовы для маральнага, патрыятычнага выхавання і развіцця асобы малодшых школьнікаў, у выніку якой ажыццяўляецца фарміраванне ведаў, уменняў, навыкаў, развіццё гістарычнага мыслення, арганізацыя самастойнай дзейнасці, звязанай з эмацыянальнымі перажываннямі, выхаванне любові да малой Радзімы.

**Тэма: Назоўнік. Змяненне назоўнікаў па склонах.**

**Мэта:** азнаямленне вучняў са склонамі  і склонавымі пытаннямі.

**Задачы:** пазнаёміць са скланеннем назоўнікаў, з назвамі склонаў і склонавымі пытаннямі;

вучыць вызначаць склон назоўнікаў у кантэксце па пытаннях і дапаможных словах;

развіваць граматычны лад маўлення;

выхоўваць патрыятычныя пачуцці, любоў да Радзімы.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу

**Ход урока**

1. **Арганізацыйны этап**
2. **Этап праверкі выканання дамашняга задання**

(У тым ліку заданняў па мясцовым краязнаўчым матэрыяле)

Аналіз творчых работ вучняў ( сачыненняў « Мая родная вуліца»). Для праверкі засваення вывучанай тэмы « Склад слова» прапаную гульню « Успомні назву».

– Як называюцца вуліцы, на якіх вы пражываеце? (Вуліца Камсамольская, вуліца Партызанская, вуліца Ю.Гагарына.)

– Як называлі гэтыя вуліцы нашы продкі? («Доўгарад», «Крывуля», «Выган».)

– Ад чаго пайшла такая назва? (Доўгарад ─ першая, доўгая вуліца ў адзін рад. Крывуля – крывая, мае ізгіб. Выган – выганялі кароў з усяго сяла на пашу.)

– Разбярыце словы («Доўгарад», «Крывуля», «Выган») па саставе.

– Усе гэтыя вуліцы ўтвараюць адно паселішча, якое называецца (Тонеж)

**3. Падрыхтоўка вучняў да работы на асноўным этапе**

**1) Арфаграфічная размінка.**

Дзеці чытаюць верш, запісаны на дошцы.

« Тонь»– гіблае месца,
Продкі папярэджвалі,
Адсюль назва вёскі,
Таму Тонеж назвалі.

– Знайдзіце словы, ў якіх ёсць арфаграмы.(Продкі, тонь, папярэджвалі, адсюль,Тонеж). Растлумачце іх.

– Вызначце, у якіх словах і якія гукі «хаваюцца» за літарамі **ж, д**.(Тонеж, продкі).Растлумачце іх напісанне.Падбярыце праверачныя словы.

– Знайдзіце слова, у якім зацвярдзелыя зычныя не маюць парных гукаў? ( Папя**рэдж**валі)

– Знайдзіце арфаграму ў слове адсюль. Растлумачце. Разбярыце слова па саставе.

– Падбярыце сінонім да слова тонь.(Дрыгва).

– Ад якога слова ўтварылася слова Тонеж? ( Тонь. Тонеш). Зрабіце гука-літарны аналіз слова Тонеж.

2) **Хвілінка чыстапісання**

– Як вы думаеце, якую літару мы сёння будзем пісаць? Чаму вы так думаеце?

Тт То Тв Тч Тд

Тонь Тонеш Тонеж

Мая родная вёска Тонеж – сястра Хатыні.

– Знайдзіце ў сказе назоўнікі, вызначце іх род.Успомніце: што абазначае назоўнік, на якія пытанні ён адказвае? Якую ролю адыгрывае ў сказе?

– Чаму нашу вёску называюць сястрой Хатыні? (У час вайны яна гэтак жа, як і Хатынь, ператварылася ў чорнае папялішча).

– Запішыце слова вайна, вызначце яго род.

Зачытваю радкі.

У вайны не жаночы твар:
Усмешка яе вусны не кранае,
У вачах гарыць агонь-пажар
І ў руках яна грацыі не мае.

– Вызначце галоўную думку верша. Чаму слова «вайна» жаночага роду, але мае не жаночы твар? Растлумачце як вы гэта разумееце? Які твар у жанчыны-маці?

(Раздаю дзецям карткі).

– Зачытайце верш.

Бабуля мая,
Як **вайну** ўспаміналa,
Са слязамі ў вачах
Так пачынала:
Жылі людзі ў міры,
Працавалі ўахвоту.

То было **да вайны**.
А што было потым!
У кожную хату
**Вайна** завітала,
Дазволу на тое
Яна не спытала.
У адзін дзень забрала
Двух бацькі братоў.
Прарадзіла суседзяў,
Радню, сваякоў.
Бабулю маю
Не ўзяла:палюбіла
І «салдацкай ўдавой»
Наўвесь век
ахрысціла.
Украла дзяцінства
У роднай матулі,
Падарвала здароўе
Другому дзядулі.
Аб гэтым не маю
Я права забыць.
І рабіць буду ўсё,
**Каб вайне** больш не быць.
Каб у міры жылі
Мае дзеці і ўнукі,
Каб не зведаў ніхто
Горыч страт і разлукі.
(Паводле В.Сакалоўскай)

- Пра што гаворыцца ў вершы? Якая галоўная думка верша?
- Хто ў гэтым вінаваты?
- Знайдзіце ў вершы адно і тое ж слова, ужытае ў розных формах. Абазначце канчаткі ва ўсіх формах.
- Што вы заўважылі?
- Які вывад вы можаце зрабіць?
- Як вы думаеце, якая тэма сённяшняга нашага ўрока?( Назоўнік. Змяненне назоўнікаў па пытаннях)
- Змяненне назоўнікаў па пытаннях называецца змяненнем па склонах або скланеннем. Гэта і ёсць тэма нашага ўрока.
- Як вы думаеце, чым мы будзем займацца на ўроку?(Пастаноўка мэтаў)

**4. Этап засваення новых ведаў і спосабаў дзеянняў**

У дзяцей на партах ляжаць карткі. Звяртаю іх ўвагу на тое, што ў беларускай мове шэсць склонаў, на склонавыя пытанні; даю заданне прачытаць самастойна і паспрабаваць праскланяць слова **вайна.**

**Фізкультхвілінка**

Мы па Тонежу гуляем
І ўсё наўкола заўважаем.
Усе вуліцы шырокія,
А дамы высокія.
Кветкі ля кожнай хаты
Жыхары гасцям рады…

**5. Этап першаснай праверкі разумення вывучанага**

– Чаму ў кожнага склону два склонавыя пытанні, а не адно?

Назоўнікі якога склону не ўжываюцца без прыназоўнікаў? Выкарыстайце дапаможныя словы і праскланяйце назоўнік **вёска**.

**Гімнастыка для вачэй**

**6. Этап замацавання новых ведаў і спосабаў дзеянняў**

Работа з падручнікам. С.79, Пр.125

**7.Этап прымянення ведаў і спосабаў дзеяння**

На партах ў дзяцей карткі з міні-тэкстам « Мая вёска».

Мая вёска лічыцца сястрой беларускай Хатыні.

Зімой 1943 года карны атрад фашыстаў сагнаў у будынак царквы 263 мірныя жыхары вёскі….

А раніцай будынак ужо гарэў. Гарэў разам з жыхарамі.

Я супраць вайны! Вайна нясе нам гора, беды.

Я за мір! Мір – гэта шчасце і радасць!

– Падкрэсліце назоўнікі, пастаўце да іх пытанні. Якім членам сказа яны з'яўляюцца?

(На дошцы запісаны сказ) Вайна– гэта гора і беды, а мір – шчасце і радасць.

– Знайдзіце падобныя сказы ў тэксце. Параўнайце іх. Зрабіце вывад.

(Назоўнікі ў сказе могуць з'яўляцца і дзейнікам , і выказнікам, і даданымі членамі сказа). Вусна праскланяйце слова мір. Запішыце сказ па памяці.

**8. Этап абагульнення і сістэматызацыі ведаў**

– Зараз пагуляем у гульню «Рыфмаванка».

1. Маркевіч усю вайну прайшоў

I да…….( *Берліна* ) дайшоў. Растлумачце правапіс вялікай літары. Пастаўце пытанне да назоўніка Берлін, вызначце яго склон.

1. Усё жыццё ные рана

У грудзях героя - …..(ветэрана). Вызначце склон назоўніка.

2. Дзякуй вам,
Вёскі сыны,
Што жывём мы
Без …….(вайны).

Вызначце склон назоўніка. Пастаўце яго ў множным ліку. Растлумачце правапіс о, а.

3. Да помніка
Прыходзяць дзеткі,
Каб палажыць
Героям……(кветкі).

Разбярыце слова па саставе.

**9. Этап кантролю і самакантролю ведаў і спосабаў дзеяння**

**Самастойная работа па картках.**

Ёсць вёска на Зямлі адна,
Мяне з Радзімай што яднае,
І назву мілагучна «Тонеж»,
З часоў далёкіх носіць-мае…

– Знайдзіце назоўнікі, праскланяйце іх. Колькі склонаў у беларускай мове? Назавіце іх пытанні.

**10. Этап карэкцыі ведаў і спосабаў дзеянняў**

Паказваю фотаздымак мемарыяльнага комплесу « Спаленым».

– Разглядзіце фотаздымак. Складзіце міні-тэкст. Знайдзіце ў тэксце назоўнікі, вызначце іх склон.

**11. Этап інфармавання аб дамашнім заданні**

Пр.128, с. 80.Скласці сінквейн на тэму Радзіма.

**12. Этап падвядзення вынікаў урока.**

Дзеці чытаюць верш:

Я жыву ў прасторнай краіне,
Завецца яна – Беларусь!
І вера мая не загіне,
Табой я жыву, ганарусь!
Куточкам, што Тонеж завецца,
Запоўнена сэрца маё,
Любоўю прасякнута, б'ецца
З Радзімай сваёй – як адно!
( Паводле Т.Леўкавец)

Радзіма – гэта тое месца, дзе ты нарадзіўся і вырас, дзе ціха, павольна працякае рачулка, дзе тая бярозка, што вітае цябе кожны ранак сваім тонкім галлём, дзе бусел ляціць у чыстым паднябессі, дзе той лес, у якім многа суніц, дзе тая дарога, па якой ты ідзеш у школу. І наша шчаслівае дзяцінства! Як не любіць гэта ўсё, такое роднае і блізкае!?

- Назавіце склоны і іх пытанні.Колькі склонаў у беларускай мове?

**13. Этап рэфлексіі.**

- Працягнуць сказ . Я люблю сваю вёску за тое, што…
- Складзіце сінквейн на тэму Тонеж.

Тонеж

Дарагі, родны.

Працуе, славіцца, спявае.

Назву горкую «Сястра Хатыні» здаўна ён мае.

Радзіма

- Чым мы займаліся на ўроку?
- Што было для вас новым?